*10. Можейко З.Я.* Песенная культура Белорусского Полесья. — Мн.: Наука и техника, 1971.

*11. Срезневский И.И.* Исследования о языческом богослужении древних славян. — СПб.: Б.и., 1848.

*12. Тевосян А.Т.* Средневековая монодия и пятилинейная нотация: расшифровка или перевод? // Музыкальная культура средневековья: Сб. науч. тр. / Центральный музей древнерусской культуры и искусства им. А. Рублева; Сост. и отв. ред. Т.В.Владышевская. — М., 1992. — Вып.2.

*А.В.Няборская*

## Мастацкія традыцыі школьнага тэатра ў Беларусі

На тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. налічвалася 14 школьных тэатраў, якія належалі езуітам, піярам і ордэну базыльян. Давалі прадстаўленні і ў Слуцку ў кальвіністкай гімназіі, у Полацку і Магілёве — у школах праваслаўных брацтваў.

Школьныя спектаклі на працягу XVI—XVIII стст. асвойвалі ў асноўным два тыпы прасторы — адкрытую плошчу і замкнёную чатырма сценамі класічную сцэну-каробку. Найбольш ранняй пляцоўкай для публічных прадстаўленняў трэба лічыць прастору перад храмам. Менавіта тут, на фоне царквы ці касцёла, узводзіліся дзвюх'ярусныя канструкцыі па тыпу сярэдневяковай містэрыяльнай сцэны. Прынцыпы ілюзорнай сцэны-каробкі, існуючай да гэтай пары, прынеслі ў практыку беларускага школьнага тэатра езуіты ў XVII ст.

Пасля прыняцця Брэсцкай уніі ў 1596 г. ордэн езуітаў адкрыў на тэрыторыі Беларусі 79 апорных пунктаў-

рэзідэнцый, місій і калегіумаў. У навучальных установах езуіты ўводзяць у практыку вучэбныя пастаноўкі (у калегіумах і школах Нясвіжа, Бабруйска, Віцебска, Гродна, Навагрудка, Оршы, Слуцка). Рэкрэацыйныя залы яны прыстасоўваюць для паказу спектакляў, а ў Брэсцкім калегіуме і Полацкай акадэміі ў XVIII ст. узводзяць спецыяльныя тэатральныя памяшканні, аснашчаныя ў адпаведнасці з існаваўшымі тэхналогіямі.

Практыка езуіцкага тэатра патрабавала уніфікацыі сцэнічнага вопыту, стварэння спецыяльных дапаможнікаў, якія б былі абавязковымі для ўсіх езуіцкіх школьных сцэн на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, куды да канца XVIII ст. уваходзілі землі Беларусі, Літвы і некаторыя землі Украіны. Езуіцкія калегіумы і школы, размешчаныя на гэтай вялізнай тэрыторыі, кіраваліся ў сваёй тэатральнай практыцы настаўленнямі Якоба Масэна, палажэннямі прац Францыска Ланга і трактата Казіміра Сарбеўскага, прафесара Віленскай акадэміі, які працаваў у 1618—1620 гг. у Полацкай акадэміі ў якасці выкладчыка паэтыкі і рыторыкі.

У прыватнасці, у сачыненні Ф.Ланга, вядомага пад назвай “Разважанне аб сцэнічнай ігры з тлумачальнымі малюнкамі і некаторымі назіраннямі над драматычным мастацтвам”, выдадзеным ў 1727 г., аўтар, апіраючыся на эстэтыку класіцызму, заклікаў вучыцца пластыцы, выкарыстоўваючы дзеля гэтага ўзоры скульптуры антычнасці і сучасны жывапіс. Твор Ф.Ланга шырока бытаваў у навучальных установах Вялікага княства Літоўскага, а да нашых дзён дайшоў дзякуючы публікацыі гісторыка рускага тэатра У.М.Усеваладскага-Гернгроса.

Матэрыялы трактатаў, выказванні тэарэтыкаў школьнага тэатра, іканаграфічны матэрыял і непасрэдны тэкст школьных драм і інтэрмедый дазваляюць гаварыць аб наяўнасці даволі развітой машынерыі (ніжніх і верхніх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

машын), якая дазваляла дасягаць эфектаў “чыстай перамены” дэкарацый на вачах у публікі, чыніць розныя пераўтварэнні, “палёты”, “правалы” і “ўзнясенні”, хваляванне мора, пажары. Школьны тэатр успрыняў ад тэатра сярэднявечча і эпохі Адраджэння ўсе тыпы асвятлення.

Можна вылучыць два тыпы дэкарацый на школьнай сцэне: аб’ёмна-прасторавыя, паверню якіх аздаблялі малюнкамі, і жывапісна-ілюзорныя, напісаныя на палотнах тэларый і куліс, перспектыва і аб’ёмы якіх грунтуюцца на чыста жывапісным спосабе. У якасці дэкарацый часта выкарыстоўваліся сапраўдныя бытавыя рэчы — мэбля, посуд, зброя і інш. Неабходна адзначыць, што ў канцы XVIII ст., па прычыне пранікнення на сцэну ідэй класіцызму, ад тэатральнага дэкаратара сталі патрабаваць “ідэальныя прасторавыя вобразы”. На сцэну пераносілася рэальная існуючая антычная архітэктура ці архітэктура, створаная ўяўленнем мастака. Яна абавязкова несла ў сабе класічны грэчаскі ордэр, якому надавалася лёгкасць прапорцый, народжаных мастацтвам XVIII ст. Школьны тэатр на працягу свайго існавання, з XVI ст. да XVIII ст., засвойваў усе аб’ёмна-прасторавыя дэкарацыйныя сістэмы, уласцівыя містэрыяльнаму тэатру Заходняй Еўропы (XVI ст.), а затым закрытую сцэну-каробку тэатра барока з дэкарацыямі-тэларыямі (XVII — першая палова XVIII ст.) і жывапісна-ілюзорнымі дэкарацыямі куліснага тыпу (другая палова XVIII ст.).

*В.Р.Гудзей-Каштальян*

## Новы беларускі балет

90-я гг. XX ст. у беларускім балеце выразна вызначаюцца цэлым шэрагам наваций. Гэтая з’ява ўспрымаецца як відавочная пакуль што ў адносінах да папярэдняга гістарычнага этапу 60—80-х гг., дзе 60-я былі найбольш



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ